*В.Л. ЖУК*

## ПЕДАГОГІКА

Асноўныя кірункі навукова-даследчай дзейнасці кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі БДУ ў апошняе дзесяцігоддзе звязаны з удасканаленнем тэорыі і практыкі вышэйшай прафесійнай адукацыі і абгрунтаваннем умоў і механізмаў павышэння яе якасці ў адпаведнасці з сусветнымі тэндэнцыямі.

Галоўныя навуковыя праблемы, якія распрацоўваюцца на кафедры з 2006 г., – гэта выяўленне заканамернасцей развіцця вышэйшай (у тым ліку педагагічнай) адукацыі і абгрунтаванне педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў усіх спецыяльнасцей як фактару асобасна-прафесійнага развіцця будучых спецыялістаў і павышэння якасці ўніверсітэцкай адукацыі. У адрозненне ад існуючай традыцыйнай сістэмы педагагічнай адукацыі ў класічным універсітэце, накіраванай на атрыманне студэнтамі дадатковай педагагічнай кваліфікацыі, педагагічная падрыхтоўка даследавана як важнейшая складаючая адукацыйнага працэсу сучаснага ўніверсітэта. Яе мэтай з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў рознаўзроўневай псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці ў адпаведнасці са ступенямі вышэйшай адукацыі і атрыманай кваліфікацыі.

Тэарэтычным і доследна-эксперыментальным шляхам даказана, што псіхолага-педагагічная кампетэнтнасць (кампетэнцыі) забяспечвае прадукцыйнае рашэнне шырокага спектра прафесійных, сацыяльных і асобасных задач, выступае асновай развіцця больш агульных сацыяльна-асобасных кампетэнцый будучага спецыяліста і ў канчатковым выніку спрыяе сфарміраванасці ў выпускнікоў сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці як абагульненага выніку прафесійнай падрыхтоўкі ва ўніверсітэце і важнейшага крытэрыю якасці сучаснай вышэйшай адукацыі.

Да асноўных навукова-практычных вынікаў адносяцца:

- упершыню на аснове сучаснага менеджменту якасці вышэйшай адукацыі і кампетэнтнаснага падыходу распрацаваны канцэптуальныя асновы педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў у класічным універсітэце (абгрунтаваны заканамернасці, функцыі і прынцыпы, сутнасныя характарыстыкі; умовы яе ўключэння ў сістэму ўніверсітэцкай адукацыі), якія выступаюць базай для стварэння сістэмы поліфункцыянальнай, варыятыўнай, педагагічнай падрыхтоўкі як сродку асобасна-прафесійнага развіцця будучых спецыялістаў і як фактару павышэння якасці ўніверсітэцкай адукацыі;
- выяўлена сістэма ўніверсальных псіхолага-педагагічных кампетэнцый выпускніка ўніверсітэта, якая выступае асновай для кантэкстнага абнаўлення зместу псіхолага-педагагічных дысцыплін, а таксама іншых дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага і агульнапрафесійнага блокаў падрыхтоўкі студэнтаў ва ўніверсітэце;
- выяўлены і адаптаваны да педагагічнай падрыхтоўкі палажэнні сучаснага менеджменту якасці і кампетэнтнаснага падыходу ў вышэйшай адукацыі, на іх аснове створана сістэма кіравання якасцю педагагічнай падрыхтоўкі, рэалізацыя якой забяспечвае пры дапамозе развіцця і дыягностыкі псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці неабходны ўзровень педагагічнай падрыхтоўкі як важнейшай складаючай якасці ўніверсітэцкай адукацыі;
- заснаваны заканамернасці развіцця псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці (і іншых груп кампетэнцый) і распрацавана методыка арганізацыі педагагічнай падрыхтоўкі, што ўключае: канструяванне зместу педагагічнай падрыхтоўкі на аснове псіхолага-педагагічных кампетэнцый і адпаведных ім аба-

гульненых псіхолага-педагагічных ведаў і ўменняў; этапы фарміравання псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці, задачы і змест якіх суадносяцца са зместам і паўзроўневымі вынікамі педагагічнай падрыхтоўкі; шляхі і спосабы развіцця псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці: 1) укараненне вучэбна-метадычнага комплексу новага пакалення па псіхолага-педагагічных дысцыплінах, што ўключае 1 электронны дапаможнік, 3 электронныя вучэбныя курсы на базе СОП «e-University», 28 вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, 3 тыпавыя вучэбныя праграмы, 9 базавых вучэбных праграм па педагагічных дысцыплінах; 2) сукупнасць адаптаваных да мэт педагагічнай падрыхтоўкі актыўных форм і метадаў навучання, праблемна-даследчых методык, развіваючых тэхналогій, базіраваных на рэфлексіўна-дзейснай аснове, якія мадэлююць сацыяльна-прафесійныя сітуацыі; 3) педагагічна мэтазгоднае выкарыстанне ў педагагічнай падрыхтоўцы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, што забяспечваюць шырокі доступ да інфармацыі (у тым ліку ў аўдыя-, відэафармаце), праблемны характар вучэбнага працэсу і актывізацыю самастойнай работы студэнтаў; 4) арганізацыя вытворчай (педагагічнай) практыкі студэнтаў з арыентацыяй на фарміраванне псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці і ўлік патрабаванняў будучай прафесійнай дзейнасці; 5) забеспячэнне змястоўна-тэхналагічнай узаемасувязі вучэбнага працэсу (педагагічнай падрыхтоўкі) і выхаваўчага працэсу ў ВНУ; 6) дыягностыка сфарміраванасці псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці на аснове комплексу абагульненых рознаўзроўневых педагагічных задач.

Распрацаваныя на падставе кампетэнтнаснага падыходу змест, структура, комплекснае вучэбна-метадычнае, інфармацыйнае і дыягнастычнае забеспячэнне педагагічнай падрыхтоўкі, сістэма кіравання яе якасцю ўкаранёны ў вучэбны працэс універсітэта і шэрагу іншых ВНУ і спрыяюць (праз фарміраванне псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці) прадукцыйнасці рашэння студэнтамі (выпускнікамі) больш шырокага кола ўніверсальных сацыяльных праблем і задач прафесійнай дзейнасці ў сферы любой прафесіі.

Канцэптуальна распрацаваная, метадычна і інфармацыйна забяспечаная варыятыўная педагагічная падрыхтоўка студэнтаў у класічным універсітэце спрыяе эфектыўнаму асобасна-прафесійнаму развіццю будучых спецыялістаў, павышэнню якасці вышэйшай адукацыі і галоўнаму сацыяльна значнаму практычнаму выніку – сфарміраванасці ў выпускнікоў сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці, якая праяўляецца ў іх здольнасці да рашэння новых складаных прафесійных і асобасных задач, павышэнні іх канкурэнтаздольнасці і адаптаванасці да сучасных сацыяльна-эканамічных умоў.

Паступіла ў рэдакцыю 15.06.11.

***Вольга Леанідаўна Жук*** – доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі. Сфера навуковых інтарэсаў – праблемы развіцця адукацыі, стандартызацыі, удасканалення педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў у класічным універсітэце; распрацоўка і ўкараненне ў вучэбна-выхаваўчы працэс ВНУ эфектыўных адукацыйных тэхналогій; пытанні выхавання моладзі, якая навучаецца, у сучасных умовах. Праводзіць сістэмнае навукова-педагагічнае даследаванне, накіраванае на распрацоўку тэарэтычна-практычных асноў мадэрнізацыі варыятыўнай педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў класічнага ўніверсітэта як фактару асобасна-прафесійнага развіцця будучых спецыялістаў і павышэння якасці ўніверсітэцкай адукацыі. З’яўляецца членам Міжнароднай славянскай акадэміі адукацыі імя Я.А. Каменскага. Аўтар больш за 150 навуковых і навукова-метадычных работ, сярод іх – манаграфія, 14 вучэбных дапаможнікаў (у тым ліку электронны падручнік).